# ПРАДМОВА

Дадзены зборнік навуковых артыкулаў патрэбна разглядаць як вынік Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя і гістарыяграфія: аб’ектыўная рэальнасць і навуковая інтэрпрэтацыя». Канферэнцыя была наладжана гістарычным факультэтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з нагоды 140-годдзя з дня нараджэння слыннага гісторыка Уладзіміра Іванавіча Пічэты, які для нас-беларусаў мае асаблівую вартасць. Ён – першы рэктар першага ў маштабе па-сапраўднаму першай беларускай дзяржаўнасці ўніверсітэта. І яму належыць выключная роля ў тым, каб наш беларускі ўніверсітэт адбыўся, стаў вызначаць галоўныя кірункі развіцця ўсёй сістэмы адукацыі і навукі ў краіне.

Між тым Уладзімір Іванавіч у першую чаргу выключны па сваіх даследчыцкіх кампетэнцыях і творчай спадчыне гісторык. Яго навуковы далягляд і раней, і асабліва цяпер вызываў і вызывае павагу ўсіх, хто лічыць сябе беларусістам, расіязнаўцам, славістам, украіністам, гістарыёграфам, архівістам, крыніцазнаўцам... З амаль што шасцісот яго надрукаваных прац ні адна не адзначана павярхоўнасцю, кан’юнктурнасцю, хаця палітычныя хвалі кідалі гісторыка як мала каго.

Сутнасць заяўленай тэмы канферэнцыі, па меркаванню яе арганізатараў, павінна была адлюстраваць якраз той стрыжань, вакол якога і праходзіла творчае жыццё У. І. Пічэты. Гэта неабходнасць засноўваць свае даследаванні нават самых вострых пытанняў на базе крыніц, адшукваць «аб’ектыўную рэальнасць» у мінулым. І ў сілу магчымага (інтэлектуальных здольнасцей, дасведчанасці і «запытаў часу» сённяшняга) ствараць свае працы, якія праз ужо кароткі час становяцца прадметам гістарыяграфічнага прачытання. А тым самым творчыя здабыткі гісторыка і той ці іншай группы гісторыкаў як правіла падвяргаюцца аналізу з пункту гледжання наяўнасці ці адсутнасці ў іх наратыве і высновах гэтай самай «аб’ектыўнай рэальнасці». Пры адсутнасці, па меркаваннях гістарыёграфаў, «праўды гісторыі» магчымы і вынясенні вердыктаў аб толькі, у лепшым выпадку, наяўнасці «навуковай інтэрпрэтацыі», толькі аўтарскага небяспрэчнага погляду.

Калі ж абагуліць, то гэты бясконцы працэс і ёсць не толькі сутнасць самой навукі гісторыі, але і сутнасць працы кожнага гісторыка, яе вонкавыя і ўнутраныя праявы. А нават і сэнс. Такі комплексны погляд на сваю працу і дазволіў у юбілейны год сфарміраваць ідэю канферэнцыі, якая б прыхіліла да сябе даследчыкаў розных накірункаў спазнання мінулага. А тым самым падвесці пэўную рысу пад ранейшымі творчымі

напрацоўкамі: на працягу многіх апошніх гадоў традыцыйна на гістфаку БДУ кафедра гісторыі Расіі і кафедра крыніцазнаўства ладзяць «Пічэтаўскія чытанні», на якіх абмяркоўваюцца дакладныя і нават вузкія пытанні айчыннай і сусветнай гісторыі, гістарыяграфіі і інш.

Галоўныя пасылы канферэнцыі відавочна адлюстравалі чатыры даклады, агучаныя на пленарным пасяджэнні (Я. У. Кодзіна, В. А. Фядосіка, С. М. Цемушава і А. А. Яноўскага). Дасланыя заяўкі дазволілі арганізатарам сфарміраваць пяць секцый, якія сваімі сутнаснымі парадыгмамі яшчэ у большай ступені падкрэслілі ідэі, закладзеныя ў назве канферэнцыі («У. І. Пічэта – навуковая і грамадска-палітычная іпастасі гісторыка», «Навука і адукацыя ў прасапаграфічным прачытанні», «Разнастайнасць гісторыі ў кагнітыўнай практыцы даследчыка», «Гісторыя як інтэлектуальная аснова неразрыўнай сувязі пакаленняў беларускага народа» і «Гістарычная крыніца: пошук, захаванне, навуковае прачытанне»).

Канферэнцыя (дакладней, памяць аб У. І. Пічэце, павага да яго) сабрала навукоўцаў Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы. З дакладамі і паведамленнямі выступілі больш за 90 чалавек – сталых прафесараў, крэатыўнай моладзі. Арганізатары палічылі за лепшае даць магчымасць выступоўцам некалькі дапоўніць свае тэксты, пераасэнсаваць высновы праз прызму тых дыскусій, якія суправаджалі іх даклады. Таму дадзенае выданне – натуральны працяг тэмы канферэнцыі і характару яго навуковых складнікаў. Гэта, як нам падаецца, зборнік навуковых артыкулаў, напісаных да канферэнцыі і дапоўненых, пашыраных пасля яе правядзення. Каб адлюстраваць мемарыяльны характар прайшоўшага навуковага мерапрыемства – 140-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Іванавіча Пічэты – асобна падаюцца артыкулы, прысвечаныя розным бакам яго творчасці і жыцця, аналізу яго прац і інш. Палічылі неабходным таксама ў гэтым першым раздзеле прадставіць разам і артыкулы прасапаграфічнага накірунку. Усе разнабаковыя тэмы нашых аўтараў у алфавітным парадку іх прозвішчаў саставілі другі вялікі раздзел зборніка. Тым самым чытачу даецца магчымасць знайсці найбольш цікавы для яго матэрыял, адначасова ўспрымаючы ўвесь спектр разнабаковых падыходаў гісторыкаў да праблем айчыннай і сусветнай гісторыі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, архівістыкі і інш.

Члены аргкамітэта канферэнцыі:
*Міхаіл Шумейка*
*Алег Яноўскі*